Умілаваныя ў Хрысце Пану Браты і Сёстры, дарагія Вернікі нашай дыяцэзіі!

Аўтар: Біскуп Гродзенскі
17.04.2022 00:00



“**Я – уваскрасенне і жыццё.**
Хто верыць у Мяне, калі нават і памрэ, будзе жыць” (Ян 11, 25–26).

Умілаваныя ў Хрысце Пану Браты і Сёстры!

Дарагія Вернікі нашай дыяцэзіі! У гэтую велікодную раніцу звяртаюся да Вас з асаблівай сардэчнасцю, каб падзяліцца радасным пасланнем веры, якое гучыць так: “Хрыстос уваскрос! Сапраўды ўваскрос!”.

Хоць у нашых сэрцах шмат непакою і іх раніць боль з прычыны пакут столькіх людзей, якія вымушаны пакідаць свае дамы і краіны, ратуючы жыццё, хоць народы жывуць у няпэўнасці наконт заўтрашняга дня, парушаецца грамадскі парадак у многіх краінах, аднак большай і мацнейшай з’яўляецца надзея, якую мы ўскладаем на Бога, міласэрнага Айца, які “так палюбіў свет, што аддаў Сына свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае” (параўн. Ян 3, 16).

Богу заўсёды важна, каб мы жылі ў згодзе і міры, а калі змагаліся, то змагаліся са сваімі грахамі і за сваю святасць.

Адзначаючы сёлетнія святы Уваскрасення Пана, будзем прасіць Таго, які стаў “Пераможцам смерці, пекла і шатана”, каб пажадаў захаваць нас у міры, каб дапамог нам

захаваць веру, Евангелле і Дэкалог і каб гэтыя каштоўнасці сталі фундаментам міру, на якім мы будзем будаваць сваю будучыню.

Дарагія Дыяцэзіяне!

Дзякую ўсім, хто ў гэтыя дні спяшаецца з дапамогай патрабуючым, запэўніваю ў сваёй малітве за тых, каго закранаюць хвароба і цярпенні. Каля пустой грабніцы Езуса прашу аб жывой веры для дзяцей, якія рыхтуюцца да прыняцця Першай святой Камуніі, і аб тым, каб маладыя людзі, якія будуць умацаваны сямю дарамі Святога Духа ў сакраманце хрысціянскай сталасці, былі сведкамі Уваскрослага Пана. Няхай усе сем'і будуць моцныя Богам, бо толькі тады яны будуць здольны перамагчы цяжкасці і перанесці нават найбольшыя жыццёвыя буры.

Перад намі святы жыцця і дабра, надзеі і любові, міру і салідарнасці, збаўлення і міласэрнасці. Жадаю Вам усім удзячнасці за дар пасхальных таямніц, бо яны з'яўляюцца задаткам нашага плённага жыцця сёння і ў вечнасці.

На гэты час сустрэчы з Уваскрослым і з бліжнімі ад усяго сэрца Вас бласлаўляю: у імя Айца і Сына, і Святога Духа.

+Аляксандр Кашкевіч

Аляксандр Кашкевіч
Біскуп Гродзенскі